**Антонаў, К.** За што? / К.Антонаў // Веснік Глыбоччыны. — 1992. — 28 ліп. — С. 1–2.

# ЗА ШТО?

У Глыбокім, у парку Перамогі непадалёк ад помніка-абеліска загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны размешчаны сціплы памятны знак. Да яго, як і да помніка, у дні ўрачыстасцей ускладаюць вянкі, кветкі, іх ускладаюць і маладажоны. На мармуровай дошцы высечаны пяць імён. Вось яны: Дзмітрый Батура, Раман Мацяюн, Аляксандр Чаронка, Аляксандр Дзегцяроў, Леанід Сандзюк.

Гэта даніна памяці тым, хто ў нікому непатрэбнай і бязглуздай вайне аддаў сваё жыцце ў Афганістане, хто ехаў туды маладым, поўным надзей на будучае, а вяртаўся ўжо на радзіму «цынкавым хлопчыкам». І хоць яны пахаваны на родных могілках Глыбоччыны, памяць аб іх сабрана тут, пад гэтым помнікам.

У свой час наша газета расказвала аб чатырох «афганцах». А вось да пятага ні ў мяне, ні ў маіх калег неяк рукі не дайшлі. Таму я ўзяўся запоўніць гэты прабел сёння.

У Перадольскай школе ёсць альбом пад назвай «У памяці і ў сэрцы назаўсёды». У ім фатаграфіі, пісьмы, граматы і іншыя дакументы, якія расказваюць аб жыцці Сашы Дзегцярова. Вось на адной з іх Саша сядзіць на руках маці. На твары не па-дзіцячаму сур'ёзны выраз. На другой – партрэт са школьнай Дошкі гонару. На трэцяй – групавы здымак выпускнікоў Перадольскай школы.

Нарадзіўся Аляксандр у Перадолах у сям'і брыгадзіра калгаса «Дружба» Якава Купрыянавіча і настаўніцы Любові Канстанцінаўны Дзегцяровых. Тут жа правёў сваё шчаслівае маленства, тут жа пайшоў у школу. З першага класа Сашу адрознівала ад многіх аднагодкаў цікаўнасць, жаданне самому дайсці да ўсяго. І вучыўся добра, асабліва яго вабіла матэматыка. Адначасова захапляўся спортам, авіямадэліраваннем. Любімым героем быў Гагарын. Дарэчы, у школе захоўваюцца лісткі са сшытка па матэматыцы.

У 1975 годзе Аляксандр ідзе ў дзевяты клас Падсвільскай сярэдняй школы. Па-ранейшаму добра вучыцца. У спорце ж паявілася новае захапленне – вольная барацьба. Аб тым, што яно не было выпадковым, сведчыць дыплом II ступені Віцебскага аблсавета таварыства «Ураджай» па вольнай барацьбе.

Вось закончана і сярэдняя школа. У атэстаце сталасці толькі «выдатна» і «добра». Якую выбраць сабе далейшую жыццёвую дарогу – у Аляксандра было даўно вырашана. У тым жа, 1977 годзе ён паспяхова здае ўступныя экзамены ў Магілёўскім педінстытуце і паступае на фізіка-матэматычнае аддзяленне.

Ужо будучы студэнтам, Аляксандр ў пісьме малодшаму брату Анатолю дзеліцца сваімі далейшымі планамі. Ен піша, што пасля заканчэння інстытута хоча звязаць сваё жыцце з морам. Там таксама патрэбны і фізікі, і матэматыкі.

Але лёс распарадзіўся па-свойму. У хуткім часе Аляксандра прызвалі па ваенную службу. І тут ён адразу знайшоў сваё месца ў салдацкім калектыве. Ды і камандзіры прыхільна адносіліся да разважлівага і ўдумлівага салдата. І не выпадкова, што ў хуткім часе яму было прысвоена званне сяржанта. Два гады салдацкай службы – што ў параўнанні з такім вялікім жыццём? Аднак яму было наканавана іншае. Неяк неспадзявана Дзегцяроў са сваімі таварышамі апынуўся ў далёкай,

незнаёмай і чужой краіне.

Аб службе ў Афганістане Аляксандр амаль нічога не паведамляў. Пісаў, што жывы, здаровы, сумуе па блізкіх, па родных мясцінах. Застаўся групавы салдацкі фотаздымак. На твары адбіты нейкі смутак, у вачах нібы прадчуванне бяды.

І бяда хутка здарылася. Як гэта было дакладна – цяжка і наўрад ці магчыма ўстанавіць. Вядома толькі, што воінскае падраздзяленне, якое рухалася па дарозе, напаролася на замініраваны ўчастак, маёр даў загад Дзегцярову і яшчэ аднаму салдату прыступіць да размініравання. І хлопцы пачалі нялёгкую, смяротную работу. Вось выцягнута і абясшкоджана адна міна, другая, трэцяя. Але нездарма кажуць, што мінёр памыляецца ў жыцці толькі адзін раз. Штосьці не спрацавала і ў іх. Аляксандр мог бы адкінуць міну ўбок. Але побач былі свае хлопцы. Магчыма гэта і прымусіла яго не выпускаць смерць з рук. Раздаўся выбух. Загінулі абодва мінёры, але дарога была свабоднай для ўсіх застаўшыхся жывых.

Далей было ўсё па шаблону. Сухое трафарэтнае паведамленне аб смерці, цынкавы гроб, дастаўлены за «казённы кошт» дамоў (вось адкуль пайшло «цынкавыя хлопчыкі»), пахаванне, пасмяротная ўзнагарода ордэнам Чырвонай Зоркі. І ўсё, быццам бы і не жыў, быццам бы і не было на свеце Сашы Дзегцярова.

Адчай запанаваў у сям'і Дзегцяровых. Маці, Любоў Канстанцінаўна, і так не моцная здароўем, канчаткова падупала. А бяда, як кажуць, адна не ходзіць. Трагічна загінуў і другі сын Анатоль. Не, не у Афганістане, а на рабоце. Аднак ад гэтага гора не меншае. Я сустракаўся і гутарыў з Якавам Купрыянавічам, якога ведаў даўно, як брыгадзіра, вясёлага, здаровага чалавека. А цяпер быццам бы падмянілі яго. Ідуць гады. І сёння, калі ўсплыла наверх праўда аб Афганістане, да болю ў душы задаеш пытанне: за што, за чые і якія інтарэсы гінулі хлопцы на далёкай чужбіне? За што склалі свае галовы два Аляксандры, Дзмітрый, Раман, Леанід? І гэта толькі на Глыбоччыне. А ўзяць усю Беларусь! Магчыма, дзяўблі ім калісьці ў галовы аб выкананні свайго інтэрнацыянальнага абавязку, аб тым. што яны прынеслі суседняму народу волю, справядлівасць, свабоднае жыццё? Ды дзе там! Няма ўжо і такога рэжыму, які яны абаранялі.

Выконваючы воінскую прысягу, яны лічылі, што служаць Радзіме, яе працвітанню і росту аўтарытэту. Аднак няма ўжо ні Радзімы ў тым паняцці, замест працвітання хаос і развал, страчаны аўтарытэт. Дык за што аддалі сваё жыцце «цынкавыя хлопчыкі»? За што?

**К. АНТОНАУ**

**Пастскрыптум:** 26 ліпеня споўнілася б Аляксандру Дзегцярову 32 гады. Загінуў жа ён 23 мая 1980 года, калі яму было няпоўных дваццаць.